В.У. Праскаловіч

# *ВОПЫТЫ ЛІТАРАТУРНАЙ ТВОРЧАСЦІ*

# ПРАКТЫКУМ

## 7 клас

Мінск
«Выдавецкі цэнтр БДУ»
2010

**УДК 821.161.3.09 (075.3=161.3=161.1)**
**ББК 83.3 (4 Беи) 2 721**
**П 70**

**Р э ц э н з е н т ы :**

кафедра беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (доктар філалагічных навук, загадчык кафедры, прафесар *Т.І. Шамякіна*);

настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі "Рэспубліканская гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі" *Л.М. Раманоўская*

**Праскаловіч, В. У.**
Вопыты літаратурнай творчасці: (Практыкум): 7-ы кл.: дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / В. У. Праскаловіч. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2010. – 96 с.: іл.

У дапаможніку ўпершыню даюцца творчыя заданні да кожнага з шасці блокаў-раздзелаў вучэбнага дапаможніка па беларускай літаратуры для 7 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання.

Прапануемыя заданні могуць быць выкарыстаны на факультатыўных занятках і для правядзення школьных алімпіяд па беларускай літаратуры.

Спосаб прэзентацыі матэрыялу дапамагае стварыць высокую матывацыю да пазнавальнай дзейнасці ў літаратуры, развівае камунікатыўныя і творчыя здольнасці вучняў і цалкам адпавядае асаблівасцям узроставай псіхалогіі.

Адрасуецца вучням, настаўнікам, студэнтам ВНУ, а таксама ўсім, хто цікавіцца праблемамі дзіцячай літаратурнай творчасці.

**ISBN 978-985-6941-75-0**

© Праскаловіч В.У., 2010
© БДУ, 2010

## ПРАДМОВА

Літаратура — мастацкая творчасць, і вывучэнне яе павінна быць творчым, задавальняць пазнавальную актыўнасць вучняў, уключаць іх у самастойную творчую дзейнасць. Далучэнне вучняў-чытачоў да мастацтва праз розныя формы творчасці, шырокі ўдзел у літаратурнай самадзейнасці зможа зрабіць навучанне сапраўды цікавым, стварыць рэальныя магчымасці не толькі для таго, каб захапляцца прыгожым, але і тварыць прыгожае.

Прынцып творчага навучання прадугледжвае выхаванне чытача, які здольны да ўласнай думкі аб прачытаным творы; уключэнне вучняў у самастойную літаратурна-творчую дзейнасць; творчы падыход да формаў і метадаў працэсу навучання літаратуры.

У вучэбным дапаможніку «Беларуская літаратура. 7 клас» (аўтары М. А. Лазарук, Т. У. Логінава) паслядоўна і настойліва ўвасабляецца адзін з асноўных прынцыпаў Канцэпцыі літаратурнай адукацыі — стымуляцыя ўласнай культуратворчасці дзяцей. Гэта забяспечваецца прадуманай сістэмай пытанняў і заданняў да твора.

У практыкуме ўпершыню даюцца творчыя заданні да кожнага з шасці блокаў-раздзелаў вучэбнага дапаможніка па беларускай літаратуры для 7 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання.

У дадзеным дапаможніку прапануюцца заданні, *якія не паўтараюць, а дапаўняюць* тыя творчыя работы, што прадугледжаны падручнікам і метадычнымі выданнямі да яго. Прыёмы і метадычныя ўмовы выканання большасці з іх настаўніку павінны быць вядомы з практыкі работы па падручніку, некаторыя ж запатрабуюць творчага і самастойнага падыходу.

Заданні накіраваны не столькі на кантроль і праверку вынікаў вучэбнай дзейнасці, колькі на фарміраванне саміх спосабаў камунікатыўна-творчай дзейнасці, на развіццё вобразнага мыслення і ўяўлення падлеткаў, эмацыянальна-каштоўнасных адносін да вывучаемага твора.

Прапанаваныя віды прадметна-творчай дзейнасці міжвольна ставяць вучня ў пазіцыю аўтара і творцы, выхоўваюць назіральнасць і чуйнасць да слова, спрыяюць развіццю эўрыстычных здольнасцей. Па выніках выканананння такіх заданняў можна меркаваць пра ступень сфарміраванасці творчых уменняў школьнікаў і кіравацца гэтым у далейшай дзейнасці. Акрамя таго, ажыццяўляецца запамінанне пры «навучанні з захапленнем».

Творчая работа вучняў каштоўная не тым, што яна можа прыносіць нейкі мастацкі плён у выглядзе завершаных твораў, а пазнавальна-выхаваўчым вынікам, таксама магчымасцю кожнаму самавыявіцца, самасцвердзіцца праз творчасць.

Прапанаваныя ў практыкуме літаратурна-творчыя заданні могуць быць выкарыстаны настаўнікам для ажыццяўлення розных відаў кантролю і ацэнкі якасці засваення вучнямі-чытачамі асноўнага вучэбнага матэрыялу і дынамікі змяненняў узроўню сфарміраванасці ў іх вопыту творчай дзейнасці. Настаўнік з дапамогай гэтых заданняў можа ажыццяўляць кантрольна-ацэначную дзейнасць як усіх вучняў класа, так і групы навучаемых або канкрэтнага вучня.

Прапанаваныя заданні могуць быць выкарыстаны на факультатыўных занятках і для правядзення школьных алімпіяд па беларускай літаратуры.

А каб не заблукаць у складаных лабірынтах загадкавай *краіны* ТВОРЧАСЦЬ, вучням на дапамогу прыйдуць такія рубрыкі, як *«Заданні з выбарам», «Карысная інфармацыя», «Наша творчасць»*, *«Дзённік назіранняў», «Маршрут пошуку», «Інтэрнэт для кнігалюбаў», «Памятайце!», «Слоўнік да задання», «Літаратурная гульня», «Рэфлексія», «Дадатак».*

**Умоўныя абазначэнні:**




— заданні з выбарам;



— наша творчасць;



— інтэрнэт для кнігалюбаў;



— малюем.

# РАЗДЗЕЛ I
# ЧАРАДЗЕЙНАЯ СІЛА МАСТАЦТВА

♦ Як вы разумееце назву раздзела падручніка «***Чарадзейная сіла мастацтва***»*?*

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

♦ Разгледзьце наступны *кластар* (што ў перакладзе з англійскай мовы абазначае «сузор'е», «пучок», «гронка») — графічная арганізацыя матэрыялу, ланцужок элементаў таго ці іншага паняцця. Дапоўніце яго і ўпішыце асноўныя віды мастацтва і сродкі, якімі яны карыстаюцца.




*Словы-памочнікі:* жывапіс (колер, фарба, адценне); музыка (гук, мелодыя); літаратура (словы) і да т.п.

♦ Паразважайце, ці маюць такія розныя віды мастацтва нешта агульнае? Прыгадайце творы, якія звяртаюцца да тэмы мастака і мастацтва.

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

♦ Алесь лепш за ўсіх разгадваў у класе загадкі. А вось над рэбусам, які яму загадалі сябры, задумаўся, бо не ведаў нават значэння гэтага слова. Растлумачце Алесю значэнне слова ***рэбус.*** Дапамажыце яму разгадаць рэбус. Запішыце адгадку.




*Адгадка:*

♦ Паразважайце, чаму мастацтва валодае вялікай сілай уздзеяння на чалавека? Прывядзіце прыклады.



♦ Падумайце, якія вобразы сімвалізуюць у літаратурных і фальклорных творах мастацтва. Складзіце гэты асацыятыўны ланцужок. З дапамогай малюнка (вобразнай, схематычнай, графічнай візуалізацыі) і яго абгрунтавання (тлумачэння, чаму такія вобразы, схемы, колеры вы абралі) падмацуйце свае ўяўленні.

*Абгрунтаванне*

**Я к у б  К о л а с. «У яго быў свет цікавы...»**
(Урывак з паэмы **«Сымон-музыка»**)

♦ Якім вы ўяўляеце Сымонку? Чым ён адрозніваецца ад іншых дзяцей? Намалюйце яго слоўны партрэт.

♦ Апішыце, як вам уяўляецца карціна адлёту журавоў, намаляванай паэтам у ніжэйпрыведзеных радках. Калі б вы валодалі здольнасцю перадаць напісанае Я. Коласам у карціне, што б вы намалявалі? Якія колеры пераважалі б на вашым палатне? Абгрунтуйце свой выбар.

*Шнур жывы, загнуты крукам,*
*Ледзь чарнеецца ўгары,*
*І ўсё стада з смелым гукам*
*Журавель вядзе стары;*
*Плыўка, згодна ходзяць крылы,*
*Як адно, у тахт адзін –*
*Пакідаюць край свой мілы,*
*Родны кут глухіх лядзін.*
*Шнур знікае, тоне ў багне*
*Мора сіняга нябёс...*

***Працуем са слоўнікам***

♦ Растлумачце значэнне слова *талент.*

♦ Падрыхтуйце невялікае сачыненне-апісанне «Хараство беларускіх пейзажаў» (на аснове вывучанага твора і самастойна выбранай рэпрадукцыі твора пейзажнага жывапісу або фотамастацтва). Наладзьце разам з аднакласнікамі, сябрамі пошук неабходнай інфармацыі, адбор патрэбных крыніц. Калі не ўдалося — не трэба адчайвацца (рэпрадукцыі твораў пейзажнага жывапісу, фотамастацтва знаходзяцца ў ***дадатку № 1***).

***Карысная інфармацыя***

Жывапіс: «Мая зямля»: альбом (уклад. В. Трыгубовіч); «Беларускі пейзажны жывапіс»: альбом (уклад. А. В. Аладава); «Радзіма Якуба Коласа»: Серыя палотнаў (У. Сулкоўскі): мастацкае электроннае выданне на 2-х кампакт-дысках. — Мінск: Маст. літ., 2006—2007; Мастацтва ў школе. — Выпуск 1. — Жывапіс, скульптура: выяўленчае электроннае выданне. — Мінск: Маст. літ., 2008.

Фотамастацтва: «Пакланіся прыродзе»: альбом; В. Алешка. «Спатканне з лесам»: альбом; С. Плыткевіч. «Мая Беларусь»: альбом; Г. Ліхтаровіч. «Добры дзень, Беларусь»: альбом; У. Арлоў, З. Герасімовіч. «Краіна Беларусь: Ілюстраваная гісторыя»: альбом (на выбар).

***Памятка да сачынення-апісання:***

1) тэма твора;
2) агульнае ўражанне, пераважная каляровая гама;
3) пярэдні план малюнка, асноўныя вобразы, іх прасторавае і колеравае вырашэнне;
4) фон, дробныя дэталі;
5) ідэйная ўстаноўка аўтара.




Да паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка» звярталіся многія беларускія кампазітары (Я. Глебаў, В. Іваноў, Л. Шлег), тэатральныя дзеячы (М. Пінігін) і інш. Наведайце (па магчымасці) спектакль па паэме Якуба Коласа «Сымон-музыка». Паспрабуйце падрыхтаваць (на выбар):

а) эскізы афішы і праграм да спектакля «Сымон-музыка»;
б) рэкламны слоган, які б, на вашу думку, зацікавіў гледача;
в) рэкламны тэкст для газеты да спектакля «Сымон-музыка»;
г) камп’ютарную каляровую версію рэкламы;
д) водгук на спектакль.

***Слоўнік да задання***

*Водгук* — выказванне ўражанняў, дзе аўтар дзеліцца сваімі думкамі аб творы, пры гэтым не ставіць мэту ўсебакова ахарактарызаваць змест і мастацкую структуру. Водгук пішацца ад імя першай асобы.

Кампазіцыйная схема:

1. Уступ (тэзіс)
2. Доказ (аргументы)
3. Вывады

## *Азбука тэатра*

***Афіша*** — (франц. affiche аб’ява ад affichee выстаўляць напаказ) — від рэкламы, паведамленне пра спектакль. Вывешваецца перад уваходам у тэатр і ў людных месцах (вуліцы, плошчы). Афішы бываюць шрыфтавыя (яны змяшчаюць асноўныя звесткі аб спектаклі, пастаноўках і выканаўцах), маляваныя (яны даюць эмблему тэатра, сцэны са спектакля і асноўныя звесткі пра яго стваральнікаў) і змешаныя (з выкарыстаннем фатаграфій). Да прэм’еры складаюцца падрабязныя афішы: называюцца аўтары, выканаўцы, пастановачная група: рэжысёры, мастакі-дэкаратары, балетмайстры і інш. На

Беларусі афішы паявіліся ў сярэдзіне XIX ст., былі як друкаванымі, так і рукапіснымі. Сёння пераважна выкарыстоўваюць афішы-плакаты, у якіх у абагульненай форме, з выкарыстаннем сімвалаў і метафар, раскрываецца змест пастаноўкі.

♦ Пазнаёмцеся з *афішамі* спектакляў (злева направа): Нацыянальнага тэатра імя Я. Купалы, Нацыянальнага тэатра оперы і балета, народнага тэатра г. Слоніма (***дадатак № 2***).

***Праграма*** тэатральная — друкаваны паказальнік спектакля. У ёй змяшчаецца назва п’есы, указваецца аўтар, рэжысёр, пастаноўшчык, мастак, кампазітар і інш., пералічваюцца дзейныя асобы і іх выканаўцы. Калі драматург у спісе дзейных асоб дае кароткія заўвагі пра іх, то гэтыя звесткі змяшчаюцца ў праграме (***дадатак № 3***).

***Слоган*** – (англ. slogan – лозунг, дэвіз) – кароткі лозунг, які выражае пэўны погляд або рэкламуе; сціслая, лёгка ўспрымальная фармулёўка рэкламнай ідэі.



♦ На адной з самых прыгожых плошчаў горада Мінска, якая носіць імя Я. Коласа, устаноўлены помнік. Пазнаёмцеся з фотаздымкам помніка (***дадатак № 4***), а калі ёсць магчымасць — прыйдзіце на плошчу. Падрыхтуйце слоўнае апісанне помніка пісьменніку. Якім паказаў скульптар паэта?

***Літаратурная гульня «Экскурсавод»***

♦ Уявіце сябе экскурсаводам. Падрыхтуйце невялікае экскурсаводчае паведамленне аб помніку. Дамоўцеся з суседам па парце, пра каго з літаратурных герояў скульптурнай групы (***дадатак № 4***) вы будзеце расказваць. Размяркуйце ролі экскурсавода і экскурсанта. Падрыхтуйце пытанні для экскурсавода. Падумайце, якімі могуць быць адказы на гэтыя пытанні. Разыграйце дыялогі ад імя літаратурных персанажаў.

***Памятайце!***

Пры падрыхтоўцы экскурсаводчага паведамлення можаце звярнуцца да прыёму завочнай экскурсіі (так бы мовіць, «падарожжа ва ўяўленні»). Актывізаваць нагляднa-вобразнае ўяўленне слухачоў магчыма не толькі з дапамогай наглядных сродкаў, але і вербальных (слоўных), невербальных (міміка, жэсты, позірк), паралінгвістычных (інтанацыя, тэмп маўлення, тэмбр голасу і г. д.). Натуральнымі ў аповедзе экскурсавода будуць выразы тыпу: «уявіце сабе», «паглядзіце направа», «паглядзіце налева», «выйдзем на плошчу Якуба Коласа» і г. д.



***Карысная інфармацыя***

Якуб Колас: жыццё і творчасць: альбом / склад. Д. Міцкевіч [і інш.]. — Мінск, 1974; Якуб Колас: жыццё і творчасць: матэрыялы для выстаўкі ў шк. / склад. І. Курбека, М. Базарэвіч. — Мінск, 1980; Якуб Колас у творчасці мастакоў / склад. Ю. Карачун. — Мінск, 1982; Шчыракоў М. Н. Творы

выяўленчага мастацтва на ўроках беларускай літаратуры. — Мінск, 1978; Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. / Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 1986.



Падрыхтуйце мультымедыйную прэзентацыю «Зямля паэта». Дадатковы матэрыял вы можаце знайсці, карыстаючыся інтэрнэт-адрасам: ***http://litmuseums.iatp.by/kolas/ru/***, а таксама — *электронным выданнем:* «Радзіма Якуба Коласа»: Серыя палотнаў (У. Сулкоўскі): мастацкае электроннае выданне на 2 кампакт-дысках. — Мінск: Маст. літ., 2006—2007; Мастацтва ў школе. — Выпуск 1. — Жывапіс, скульптура: выяўленчае электроннае выданне. — Мінск: Маст. літ., 2008 і інш.

## Я н к а К у п а л а. «Курган»

♦ Пазнайце героя па апісанні знешнасці:
*а) Невыдумная світка — убор на плячах, // Барада, як снег белы — такая, // Незвычайны агонь у задумных вачах, // На каленях ляглі гуслі-баі;*
*б) Недаступны і грозны, як хорам... .*
***Адказ:***
*а)*______________________________________________
*б)*______________________________________________

♦ Падрыхтуйце выразнае чытанне раздзела, які вас найбольш уразіў.

***Памятайце***: асноўныя этапы падрыхтоўкі выразнага чытання паэтычнага (вершаванага) твора:

— прачытаць твор (урывак) або праслухаць яго ў аўтарскім выкананні, у выкананні майстроў слова;
— пазнаёміцца з яго зместам і вобразамі;
— вызначыць асноўны настрой;
— яшчэ раз перачытаць тэкст, паразважаць над ім;
— вызначыць тэму, асэнсаваць асноўную думку твора, зразумець, якія пачуцці валодалі аўтарам, калі ён ствараў яго, што ўразіла, здзівіла паэта, падштурхнула ўзяцца за пяро;
— пастарацца абудзіць у сваім уяўленні вобразы, створаныя паэтам, пранікнуцца настроем твора і нібы «прысвоіць» пачуцці аўтара;
— паспрабаваць выразна перадаць пры чытанні ўсе перажыванні і эмоцыі, выказаныя ў творы;
— паспрабаваць запісаць уласнае чытанне на магнітафон (або дыктафон);
— пастарацца праслухаць і прааналізаваць сваё выканальніцкае майстэрства, зрабіць адпаведныя высновы і паспрабаваць яшчэ раз прачытаць твор, ужо з улікам заўважаных і выпраўленых недахопаў.

♦ Праслухайце (па магчымасці) выразнае чытанне паэмы ў выкананні заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Ільі Кургана [гл.: Творы па беларускай літаратуры для завучвання на памяць. Паэмы, вершы, проза, песні:

гукавое электроннае выданне на 2 кампакт-дысках. — Мінск: Маст. літ., 2007] і параўнайце са сваім варыянтам.

♦ Параўнайце апісанне гусляра ў «Кургане» з мастацкім увасабленнем вобраза музыкі на карцінах М. Басалыгі і В. Шаранговіча (***дадатак № 5***). Якія асаблівасці знешняга выгляду, манеры паводзін, адзначаныя Я. Купалам, перададзены на ілюстрацыі? Якая ілюстрацыя больш дакладна, на ваш погляд, перадае стан душы героя? Якая ілюстрацыя вам больш падабаецца? Падрыхтуйце паводле яе мастацкае расказванне, выкарыстоўваючы ўрыўкі з паэмы.

Ці можна меркаваць, што мастакі М. Басалыга, В. Шаранговіч пры стварэнні карцін абапіраліся на змест паэмы Я. Купалы «Курган»? Абгрунтуйце свой адказ.

*Абгрунтаванне*

______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________

♦ Распрацуйце праект помніка літаратурнаму герою (гусляру), матывуйце свой выбар. Супастаўце з ілюстрацыямі беларускіх мастакоў да паэмы Янкі Купалы «Курган.

______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________

♦ Падрыхтуйце (пісьмова) міні-даследаванне «Агульнае і рознае ў паэме Янкі Купалы «Курган» і ілюстрацыях М. Басалыгі, В. Шаранговіча да яе» па ***алгарытме:***

а) час напісання; б) колеры ў творы; в) асноўныя вобразы; г) пярэдні план і фон; д) ідэйная ўстаноўка аўтараў, яе суаднесенасць з часам.

♦ Разгадайце наступную ***крыжаванку.***




Пытанні да крыжаванкі:

1) Якія грошы абяцаў заплаціць князь гусляру за песню? *(дукаты)*
2) На якім музычным інструменце іграў гусляр? *(гуслі)*
3) Будынак, дзе жыве князь. *(хорам)*
4) Герой паэмы, які за свой смелы ўчынак паплаціўся жыццём – быў закапаны жывым у магілу. *(гусляр)*
5) Якой зброяй грымнуў князь, што «толькі з лёскатам выбегла рэха»? *(шабля)*
6) Герой паэмы – увасабленне жорсткай, бесчалавечнай улады. *(князь)*

♦ Наведайце (па магчымасці) Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы і пазнаёмцеся з выставай «Курганы шмат чаго нам гавораць…» (да 100-годдзя паэмы Янкі Купалы «Курган»). Падрыхтуйце водгук аб выставе.



Наведайце афіцыйны сайт музея:
***www.kupala – museum. by***

Падрыхтуйце прэзентацыю вобраза народнага песняра (паводле твораў фальклору або мастацкай літаратуры).

***Слоўнік да задання***

*Прэзентацыя* — адна з разнавіднасцей рэкламы. Мэта прэзентацыі — зацікавіць аўдыторыю чымсьці новым (кнігай, вынікамі даследавання), пазнаёміць з цікавай асобай.

Вучэбная прэзентацыя мае такую структуру:

*Уступ.* Для ўстанаўлення кантакта з аўдыторыяй уступ найлепш пачынаць словамі: «Спадзяюся, што пасля знаёмства з героем (кнігай, пісьменнікам, мастаком)...» або «Маю надзею, што прадстаўленыя матэрыялы (аўдыя- / відэа-, слайды) творчай біяграфіі пісьменніка (мастака, кампазітара і г.д.) зацікавяць вас асобай...».

*Асноўная частка.* Змяшчае кароткую характарыстыку таго, што прэзентуецца. Інфармацыя павінна зацікавіць, заінтрыгаваць прысутных.

*Заключэнне.* Падвядзенне вынікаў, падсумаванне; выказванне падзякі слухачам за ўвагу.

***Прыблізны варыянт прэзентацыі любімага героя***

«Вітаю вас, шаноўныя сябры! Спадзяюся, што пасля знаёмства з маім любімым героем – персанажам многіх твораў фальклору, літаратуры і мастацтва – вы захочаце даведацца аб ім як мага больш. Маю надзею, што падрыхтаваная мною мультымедыйная прэзентацыя зацікавіць вас вобразам гусляра.

Ці ёсць сярод прысутных той, хто не чуў пра гусляра? Упэўнены (упэўнена), што няма. Хто ж ён, гэты музыка-чарадзей, музыка-пясняр, які нёс народу прыгажосць роднага слова і мелодыі?

***Гусляр*** – народны музыкант *(слайд № 1)*, які граў на гуслях *(гучыць фрагмент з музычнага твора кампазітара І. Лучанка. Кантата «Курган» (паводле паэмы Янкі Купалы))* і часам пад акампанемент спяваў народныя песні.

Гусляр – старажытнарускае слова *(стараславянскае гусельник, гусленик).* Людзі, што прысвяцілі жыццё складанню вершаў і выкананню іх пад музыку, вядомыя былі ў розных народаў свету яшчэ са старажытнасці. Паводле міфаў Старажытнай Грэцыі першым музыкам быў Арфей *(слайд № 2)* – сын бога Сонца, і таму яго імя перакладаецца, як «той, хто вылечвае святлом». Сваімі спевамі і музыкай ён уздзейнічаў не толькі на людзей і жывёл, а нават на камяні і рэкі. Гэты вобраз з'яўляецца сімвалам мастацтва. З тых часоў паслядоўнікі Арфея вандравалі па краінах і пад гукі музычых інструментаў – гусляў, ліры, гітары і інш., выконвалі ўласныя ці фальклорныя творы. На Беларусі іх называлі яшчэ лірнікі. Усе гэтыя таленавітыя выканаўцы былі імправізатарамі. Яны хутка, без спецыяльнай падрыхтоўкі маглі складаць і тут жа выконваць вершы на пэўную тэму.

Гусляр больш сустракаецца як рамантычны вобраз у мастацкай літаратуры. Такім ён паўстае, напрыклад, у паэме Янкі Купалы «Курган»:

нязломны і горды герой, барацьбіт за народнае шчасце. Характэрна, што адзін з першых сваіх зборнікаў вершаў паэт назваў «Гусляр» *(слайд № 3)*.

Прапаную вам праслухаць I раздзел паэмы ў выкананні майстроў слова *(гучыць выразнае чытанне паэмы ў выкананні заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Ільі Кургана [гл.: Творы па беларускай літаратуры для завучвання на памяць. Паэмы, вершы, проза, песні: гукавое электроннае выданне на 2 кампакт-дысках. — Мінск: Маст. літ., 2007]*.

У вобразе Гусляра Янка Купала апаэтызаваў мужнага і адважнага чалавека, любімага народнага героя, гатовага загінуць за свой народ.

Над увасабленнем вобраза гусляра працавалі ў розныя часы майстры музыкі, жывапісу, скульптуры (*слайд № 4*).

Вашае ўяўленне аб герою ўзбагаціцца таксама пасля наведвання Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы і азнаямлення з выставай «Курганы шмат чаго нам гавораць…» (да 100-годдзя паэмы Я. Купалы «Курган»). Думаю, што ў вас ўзнікла жаданне перагарнуць старонкі неўміручай Купалавай паэмы.

Я вельмі ўдзячны (удзячна) вам за ўвагу. Да новых сустрэч!».

## ***Слайды да прэзентацыі***

Слайд № 1



***Гусляр*** – народны музыкант

Слайд № 2



Паводле міфаў Старажытнай Грэцыі першым музыкам быў **Арфей** – сын бога Сонца, і таму яго імя перакладаецца, як «той, хто вылечвае святлом».

Слайд № 3



Адзін з першых сваіх зборнікаў вершаў Янка Купала назваў «Гусляр»

Слайд № 4



Вобраз Гусляра ў жывапісе (мастак В. Шаранговіч)



Падрыхтуйце з таварышамі (калектыўная работа):
а) праграму паэтычных чытанняў на тэму «Неўміручая сіла мастацтва»;
б) выставу кніг, малюнкаў да любімых твораў на тэму мастака і мастацтва;
в) аформіце плакаты з выказваннямі аб мастацтве і мастаках;
г) вусна (пісьмова) апішыце залу, дэкарацыі.

♦ Складзіце спіс (работа ў парах) літаратурных твораў розных аўтараў аб мастацтве, якія ўвойдуць у самаробны зборнік; дайце яму назву, падбярыце ілюстрацыі да твораў, падрыхтуйце звесткі аб іх аўтарах і гісторыі іх напісання.

***Літаратурная гульня***

Перад вамі ***цэнтон*** (ад лац. cento — адзенне, пашытае з розных абрэзкаў) — верш, складзены з урыўкаў розных твораў аднаго ці некалькіх паэтаў.

♦ Адгадайце аўтараў асобных радкоў і назвы твораў, адкуль яны ўзятыя. Вы можаце працягнуць гэты цэнтон, выкарыстаўшы яшчэ адну цытату.

*Паміж пустак, балот беларускай зямлі,*
*На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай,*
*Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі, –*
*Ўдзірванелы курган векавечны.*
*Як матулька, вярба*
*Хіліць голаў над ім,*
*І глядзяцца кусты*
*Пышным верхам сваім.*
*Абступаюць яго*
*Чараты, асака,*
*Падыходзіць мурог*
*Да яго здаляка.*

♦ Прачытайце (самастойна) апавяданне Г. Сянкевіча «Янка-музыка». Абмяняйцеся з аднакласнікамі ўражаннямі аб прачытаным творы. Падрыхтуйце водгук на самастойна прачытаны твор.

♦ Уявіце наступную жыццёвую сітуацыю: вам пашчасціла трапіць у госці да Леаніда Якубовіча — вядучага тэлевізійнай гульні «Поле цудаў». Атрымаць суперпрыз давядзецца толькі ўважліваму чытачу апавядання Г. Сянкевіча «Янка-музыка». З гэтай мэтай разгадайце наступную ***крыжаванку***.

Упісаўшы па гарызанталях словы-адказы на ніжэйпрыведзеныя пытанні, вы здолееце назваць ключавое слова (па вертыкалі), якое абазначае адлюстраванне жыцця ў мастацкіх вобразах.




1. Музыкант або від мастацтва.
2. Птушка, якая адгаворвала Янку лезці ў пакой па скрыпку.
3. Імя вартаўніка, якога прызначылі пакараць Янку.
4. Здольнасць да творчасці.
5. Краіна, з якой вярнуліся гаспадары маёнтка.
6. Занятак маці героя.
7. Пакой, у якім знаходзілася скрыпка.
8. Прозвішча аўтара твора.
9. Свята збору ўраджаю, на якім герою даводзілася слухаць скрыпку.

**Словы-памочнікі:** Буфетная, дажынкі, Сянкевіч, талент, Стах, казадой, музыка, падзёншчыца, Італія.